Бяспека дзяцей – бесперапынная праца дарослых

(Молодечненский район)

Канікулы – цудоўны час, які вельмі чакаюць дзеці. Але кожны вучань абавязаны ведаць і выконваць правілы бяспекі. Гэта павінны кантраляваць бацькі. Менавіта таты і мамы нясуць адказнасць за бяспеку свайго дзіцяці. Нажаль, у час канікул павялічваюцца няшчасныя выпадкі з удзелам дзяцей, якія засталіся без дагляду.

Супрацоўнікі Маладзечанскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях пятнаццатага мая ў targовым цэнтры “Спутнік” нагадвалі бацькам асноўныя правілы бяспекі, выкарыстоўваючы розныя гульні і віктарыны. Былі такія мамы і таты, якія пра бяспеку ведаюць усё. Супербацькі атрымалі ў якасці падарунка аўтаномны пажарны апавяшчальнік.

Яшчэ раз нагадваем, якія правілы патрэбна напомніць сваім дзецям перад летнімі канікуламі.

Абавязкова нагадайце дзецям свой дамашні адрас і тэлефоны экстранных служб 101, 112, 102, 103, 104. Не лішнім будзе каля тэлефона прымацаваць ліст з гэтымі нумарамі і растлумачыць дзецям пры якіх выпадках на які нумар трэба тэлефанаваць. Нагадайце сваім дзецям, што ў выпадку пажара неабходна адразу выбегчы на вуліцу і клікаць на дапамогу дарослых. Ні ў якім разе не хавацца пад ложак або ў шафу! Растлумачце сваім дзецям чаму ад агню нельга схавацца і што тушыць яго маюць права толькі выратавальнікі. Запалкі і запальнічкі захоўвайце ў недаступным для дзяцей месцы. Таксама не дазваляйце малым дзецям выкарыстоўваць газавую пліту і электрапрыборы. Нажаль, былі выпадкі, калі дзеці дванадцаці і больш гадоў атрымлівалі апёкі вялікай плошчы, калі самастойна разагравалі сабе ежу на пліце.

Шмат дзяцей паедуць на канікулы да дзядуль і бабуль у вёску. Нагадайце сваім бацькам, каб пераканаліся, что ў хаце няма нічога небяспечнага для вашых дзяцей. Неабходна схаваць лекі, вязальныя спіцы, нажніцы, бытавую хімію і другія прадметы, якія небяспечны для дзяцей. Калі дзеці будуць гуляць на вуліцы за імі таксама трэба пільна сачыць увесь час. Былі выпадкі, калі малыя танулі ў возеры, каля хаты, застаўшыся без нагляду ўсяго на пару хвілін. Трагічны выпадак здарыўся з дзвумя вучнямі, якія нашлі ў бабулі спіртавую настойку і спрабавалі зрабіць факел.  У выніку загінула бабуля, якая ратавала

ўнука і хлопчык васьмі гадоў.  Каб з вашым дзіцем нічога не здарылася важна ведаць дзе ён знаходзіцца і чым займаецца!

Выратавальнікі рэкамендуюць дзеля дапамогі бацькам у навучанні дзяцей правілам бяспекі мультфільм МНС “Цудоўная кніга”. Паглядзіце з сваімі дзецьмі ўсе серыі, разбярыце з дапамогай героеў мультфільма надзвычайныя сітуацыі. Растлумацче, як іх недапусціць, а калі і здарылася бяспечная сітуацыя, як з яе выйсці. Знайсці мультфільм вы можаце на афіцыйным youtube канале МНС. Паважаныя бацькі, беражыце сваіх дзяцей.